**Н. Пекар**

# ТЭМА КАХАННЯ Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Даследуючы творчасць М. Багдановіча, мы прышлі да думкі, што тэма кахання адна з асноўных тэм яго творчасці. Прыгожае, светлае пачуццё, якое ўзвышае чалавека, робіць яго лепшым, высакароднейшым. Прычым яно звязваецца ў бінарную апазіцыю кахання і смерці.

Прааналізаваўшы творы М. Багдановіча, мы заўважылі, што ў вершы «Маладыя гады» паэт услаўляе сілу, прыгажосць чалавечых пачуццяў і ставіць філасофскія пытанні: сэнсу жыцця, прызначэння чалавека, сілу пачуццяў маладога сэрца. Сярод вершаў аб каханні вылучаецца раманс «Зорка Венера» − гэта вельмі лірычны музычны твор. Ён кранае душэўнай чысцінёй, праўдзівасцю выказаных пачуццяў. Сімвалам кахання ў рамансе выступае Венера – краса вячэрняга неба. Высакароднае пачуццё закаханага, боль ад растання з каханым чалавекам, прызнанне ў нязменнай адданасці яму па-мастацку дасканала выказаны ў «Трыялеце». У цыкле вершаў «Мадонны», прысвечаным Ганне Какуевай, М. Багдановіч увасобіў сваё разуменне вобраза мадонны – ідэала высокай красы, жаноцкасці, хараства, дабрыні і чалавечнасці. У нізцы вершаў «Каханне і смерць» пераважаюць сумныя, трагічныя ноты пра згубленае каханне. Яны навеяны асабістай драмай сям’і Багдановічаў (спачатку смерцю маці, а затым другой бацькавай жонкі, жыццём заплаціўшай за нараджэнне сына). Радасць кахання і пакуты пастаўленыя побач, адлюстроўваюць дуальнасць свету. Аднак каханне – высакароднейшае і наймацнейшае пачуццё – здольна перамагчы нават жах смерці.

Вершы М. Багдановіча пра каханне сцвярджаюць ідэю бессмяротнасці, вечнасці гэтага высокага чалавечага пачуцця, яго вялікую жыццёвую і стваральную сілу. Яны спрыяюць раскрыццю лепшых якасцей чалавека, праяўленню гуманнасці, высакароднасці, садзейнічаюць выхаванню пачуцця павагі да жанчыны, яе хараства, прывабнасці, душэўнай чысціні. Чытачу раскрываецца ўся шматграннасць кахання – ад першых парасткаў пачуцця да драматычна-ўзвышанага стану душы і сэрца на зыходзе чалавечага жыцця.

Зрабіўшы аналіз, мы заўважылі, што для любоўнай лірыкі М. Багдановіча характэрны пяшчота, цеплыня, загадкавасць, пранікненне ў тайну сэрца каханай. Паэтычная філасофія быцця Максіма Багдановіча заснавана на спавяданні выратавальнай моцы кахання і чалавечнасці.

Лёгкія, далікатныя радкі вершаў М. Багдановіча, напоўненыя каханнем да жанчыны, прымушаюць трапятаць сэрца і спадзявацца на ўзнёслыя, выдатныя пачуцці ў сваім жыцці. Калі чытаеш яго вершы пра каханне, усё шэрае і штодзённае сыходзіць. У творчасці М. Багдановіча праз тэму кахання адлюстроўваецца дуальнасць свету, пошукі сэнсу жыцця і ўласнага прызначэння.